## Пастанова № 991 не зусім адпавядае патрэбнасцям беларускай эканомікі

**Пастанова Савета Міністраў № 991 «Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» не зусім адпавядае актуальным патрэбнасцям беларускай эканомікі. Такую думку выказаў журналістам памочнік Прэзідэнта Беларусі Сяргей ТКАЧОЎ.**

«Калі мы гаворым пра далучэнне прыватнага бізнэсу да рэалізацыі дзяржпрадукцыі, то, вядома, пастанова ўрада № 991 наўрад ці будзе адпавядаць надзённым патрэбнасцям. Штосьці пры распрацоўцы гэтага дакумента не прадумалі, не супаставілі з жыццём, з інтарэсамі сённяшняга дня», — лічыць памочнік кіраўніка дзяржавы.

**БЕЛТА.**

## Прэзідэнту Беларусі будуць штотыднёва дакладваць аб дзеяннях канкрэтных прадпрыемстваў па разгрузцы складоў

**Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі сумесна з Камітэтам дзяржкантролю возьме пад строгі нагляд выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па рэалізацыі запасаў прадукцыі. Як паведаміў журналістам памочнік Прэзідэнта Сяргей ТКАЧОЎ, аб гэтым кіраўніку дзяржавы будзе дакладвацца штотыднёва.**

Паводле слоў Сяргея Ткачова, па выніках першага паўгоддзя трэба засяродзіць увагу на дзвюх ключавых праблемах беларускай эканомікі: адмоўным сальда і празмерных запасах прадукцыі. «На вырашэнні гэтых праблем павінны быць сканцэнтраваны намаганні ўсёй нашай эканомікі і тых, хто адказвае за яе развіццё, а гэта перш за ўсё ўрад», — сказаў ён. «Запасы прадукцыі — самае вузкае звяно ў нашай эканоміцы, ухапіўшыся за якое мы выцягнем усе нашы праблемы і падрыхтуем эканоміку да будучага рыўка», — дадаў памочнік Прэзідэнта. Згодна са статыстыкай, на 1 ліпеня запасы на беларускіх прадпрыемствах складалі Br7,4 трлн, у параўнанні з мінулым годам яны ўзраслі на Br3,3 трлн.

У мэтах больш актыўнага падключэння прадпрымальнікаў Беларусі да экспарту айчынных тавараў можна вызваліць іх ад выплаты ПДВ па некаторых відах прадукцыі, падкрэсліў Сяргей Ткачоў. Гэта могуць быць, напрыклад, тавары швейнай і трыкатажнай падгалін лёгкай прамысловасці.

Калі прадаставіць такую льготу ў выглядзе адмены ПДВ лёгкай прамысловасці, урон бюджэту ад гэтага будзе самы мінімальны, і пры гэтым значна большую выгаду прынясе актывізацыя экспарту гэтых відаў прадукцыі пры ўдзеле прыватнага бізнэсу. «Калі мы адменім ПДВ у гэтых галінах або будзем налічваць, але дазволім яго не выплачваць, тады нашы бізнэсмены змогуць спакойна «перацягваць» прадукцыю ў любую краіну: у Расію, на Украіну, куды хочаце», — растлумачыў памочнік Прэзідэнта.

**БЕЛТА.**

## Шукаў вясковец у спёку айчынны «холад»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як патлумачыла далей Святлана Аляксандраўна, у кожнай краме ёсць кніга заказаў (пра тое і мы самі даводзілі заяўніку), у якой можна замовіць патрэбную мадэль таго ж маразільніка. Прадаюць іх у парадку чарговасці, імкнуцца нікога не крыўдзіць. Скажам, улічваюць колькасць дзетак у сям'і, інваліднасць пакупніка і іншае. Усё цудоўна, толькі з улікам штомесячных паставак маразільнікаў на ўвесь раён, дакладней, іх колькасці і колькасці магчымых ахвотных набыць агрэгат, колькі той жа наш заяўнік можа стаяць у такой чарзе? Суразмоўца пагадзілася, што, не выключана, два-тры месяцы. А сезон жа масавых нарыхтовак — цяпер, працягнецца ў самы бліжэйшы час!... Хоць, паўторымся, гандаль толькі прадае тое, што атрымлівае. А прадаваць можа больш.

Сітуацыя, падобная вышэйапісанай, назіраецца і ў суседнім Слуцкім раёне. Памятаеце, заяўнік заўважыў, што ад яго вёскі да Слуцка нават бліжэй, чым да Капыля? Таму мы звярнуліся і ў тамтэйшае раённае спажывецкае таварыства. Гэтае падабенства нам пацвердзіла **намеснік старшыні па гандлі Алена БЕРАЗОЎСКАЯ.** Паводле яе слоў, насельніцтва без асаблівых праблем можа набыць сучасныя двухкампрэсарныя халадзільнікі, у якіх ёсць і маразільныя камеры. Аднак попыт на ўласна маразільнікі большы, а пастаўляюць іх з завода менш, чым хацелася б.

Як ні дзіўна, аднак пры ўсім гэтым менавіта тут з'явілася надзея на канкрэтнае вырашэнне праблемы нашага заяўніка. Выслухаўшы аповед пра пакуты вяскоўца з пошукамі маразільніка, Алена Іванаўна заўважыла: у вёсцы Знамя якраз стаіць зараз маразільнік. Мы перадалі суразмоўцы кантактны нумар тэлефона мужчыны і Алена Іванаўна паабяцала з ім абавязкова звязацца. «Калі яму падыдзе тая мадэль, няхай забірае, чаго той маразільнік будзе стаяць?».

На жаль, на працягу дня ў нас так і не атрымалася звязацца з прадстаўнікамі закрытага акцыянернага таварыства «Атлант», каб пачуць іх каментарыі адносна той сітуацыі, што склалася прынамсі ў двух вышэйназваных раёнах.

***P.S. Калі матэрыял ужо быў падрыхтаваны для друку, мы вырашылі патэлефанаваць і самому нашаму заяўніку — ці атрымалася ў яго вырашыць сваю праблему? Як высветлілася, не. «Так, мне патэлефанавалі са Слуцкага раённага спажывецкага таварыства, прапанавалі маразільнік. Але ён аказаўся ўкраінскай вытворчасці. А ў нас уся тэхніка — беларуская, ад «Атланта», таму хочам і маразільнік толькі ад гэтага вытворцы. Вырашылі, будзем чакаць. Мне паабяцалі, што як толькі патрэбнае з'явіцца на базе, нам паведамяць. Я ж у тым ліку, звяртаючыся да вас, хацеў даведацца: чаму ўвесь час гучаць заклікі набываць беларускае, падтрымліваць свайго вытворцу, Прэзідэнт пра тое гаворыць, а гэтых самых айчынных тавараў няма?..»***

***P.P.S. Пасля гэтых слушных слоў вяскоўца падумалася, што ўсё ж без каментарыя прадстаўнікоў «Атланта» не абысціся. Не атрымалася пачуць патрэбную інфармацыю па тэлефоне, спадзяёмся убачыць яе ў пісьмовым выглядзе.***

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Рыхтуемся да школы: скідкі, крэдыт, растэрміноўкі...

**У канцы жніўня, калі праяўляецца найбольшая актыўнасць пакупнікоў, адбудзецца агульнагарадскі мінскі кірмаш «Прывітанне, школа!», у якім прымуць удзел прадпрыемствы нехарчовай і харчовай гандлёвай сеткі. А з 22 па 30 жніўня ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» па вул. Я.Купалы, 27 будзе працаваць 3-я міжнародная выстаўка-кірмаш «Нашым дзецям 2009» і 10-я спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Добры дзень, школа!».**

ГУМ з 1 ліпеня прадае тавары школьнага асартыменту ў крэдыт. Пры куплі на суму Br350 тыс. і больш прадастаўляецца беспрацэнтны крэдыт тэрмінам на 3 і 6 месяцаў з першапачатковым узносам 10 працэнтаў ад кошту пакупкі. ЦУМ запланаваў правесці ў жніўні 22 распродажы адзення, абутку, школьна-пісьмовых прыладаў. Гандлёвы дом «На Нямізе» з 1 ліпеня на 15 працэнтаў знізіў цэны на тавары школьнага асартыменту вытворчасці прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам». Акрамя таго, пастаянна ў першую і апошнюю гадзіну работы ўнівермага на ўсе пакупкі прадастаўляецца скідка ў памеры 2 працэнты, усе скідкі падсумоўваюцца. Амаль 20 распрадажаў арганізуе ўнівермаг «Беларусь». Пры продажы школьнага адзення прадугледжана скідка 15 працэнтаў на асобныя мадэлі адзення для школьнікаў. Фірменны магазін «Прамень» з 1 па 31 жніўня правядзе акцыю «Хутка ў школу!». Абутак школьнага асартыменту шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, будзе прадавацца са скідкай 10-20 працэнтаў.

### Поўная экіпіроўка першакласніка будзе каштаваць мінскім бацькам ад Br350 тыс. да Br675 тыс.

**Крыху даражэй будуць каштаваць бацькам зборы дзяцей — вучняў малодшых класаў — ад Br417 тыс. да Br740 тыс. А на падрыхтоўку старшакласнікаў да школы неабходна будзе патраціць ад Br518 тыс. да Br995 тыс.**

Кошт набору школьна-пісьмовых прыладаў для першакласніка складае ад Br98 тыс. да Br280 тыс.

**БЕЛТА.**

## Абзац

◢ Беларуская чыгунка адмяніла спагнанне камісійнага збору за папярэдні продаж білетаў у прыгарадных цягніках. Як і раней, прыгарадныя білеты можна купіць за 10 дзён да паездкі, але цяпер плаціць за гэта не трэба. Раней камісійны збор складаў Br250.

◢ **Пракуратура пачала крымінальную справу ў дачыненні да выкладчыка Інстытута турызму пры БДУФК за падбухторванне да хабару за станоўчую адзнаку на экзамене па фізічнай культуры пры паступленні ва ўніверсітэт. Выкладчык сцвярджаў, што хабар быццам бы меркаваўся для кіраўніцтва ўніверсітэта фізкультуры. Сума хабару складае 1600 дол. ЗША. Гэтая крымінальная справа распачатая ў рамках папярэдняй, калі ў канцы ліпеня была затрымана член прыёмнай камісіі БДУФК у момант атрымання 1 тыс. долараў.**

## Поўны абзац

◢ У Маскве 2-гадовае дзіця падчас руху выпала з аўтамабіля, а маці заўважыла яго прапажу толькі дома. У той дзень маладая жанчына вярталася з крамы разам са сваімі двума дзецьмі, якія сядзелі на заднім сядзенні. На словы старэйшага хлопчыка аб тым, што брацік няма побач, маці адмахнулася, палічыўшы, што той жартуе. Прапажу яна заўважыла толькі тады, калі прыехала дадому. Дрыжачы ад страху, яна праехала зваротным шляхам, але сына нідзе не заўважыла, пасля чаго звярнулася ў міліцыю. Як высветлілася, хлопчыка выратаваў вадзіцель машыны, што ехала следам. Ён не паверыў сваім вачам, калі на дарогу вывалілася дзіця, і спыніў аўтамабіль літаральна за сантыметры ад хлопчыка. Схапіўшы яго, ён пабег у міліцыю. Адразу ж выклікалі «хуткую», але яе дапамога не спатрэбілася — дзіця практычна не пацярпела, толькі крыху падрапала галаву.

◢ **Расіяне штогод «прапіваюць» столькі ж новых аўтамабіляў, колькі купляюць, са шкадаваннем адзначыў спікер Дзярждумы Барыс Грызлоў. Ён паведаміў, што летась на алкаголь і піва ў таварнай структуры рознічнага гандлю прыйшлося 7,7 %, а на легкавыя аўтамабілі — 8 %, г.зн. практычна столькі ж. «Кажучы іншымі словамі — што не так прыемна, але шчыра — расіяне кожны год «прапіваюць» столькі ж легкавых аўтамабіляў, колькі купляюць», — сказаў ён.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## «СЁЛЕТА ПА МНОГІХ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ СПАЖЫЎЦАХ БЫЛА ПЕРАГЛЕДЖАНА СІТУАЦЫЯ І ПРЫНЯТЫ РАШЭННІ АБ ПАДАЎЖЭННІ ІХ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ЦЕПЛАЗАБЕСПЯЧЭННЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Набыццё і ўсталяванне ў аднакватэрных і блакіраваных жылых дамах, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян, прыстасаванняў для ацяплення і гарачага водазабеспячэння прадугледжваецца за кошт уласных сродкаў грамадзян і прыцягнення імі крэдытных рэсурсаў. Для гэтага створана дастатковая нарматыўная база, у тым ліку крэдыты, што прадугледжваюцца Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 75 ад 07.02.2006 і № 368 (у рэдакцыі) ад 02.06.2006 г.

У той жа час, захоўваючы нормы Закона Рэспублікі Беларусь № 617-XII ад 20.02.1991 г. «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», сродкі мясцовых бюджэтаў могуць накіроўвацца на праектаванне і будаўніцтва вулічных размеркавальных газаправодаў, газаправодаў-уводаў і ўнутрыдамавых сістэм газазабеспячэння, уключаючы набыццё індывідуальных прыстасаванняў для ацяплення і гарачага водазабеспячэння, пры правядзенні па рашэннях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аптымізацыі схемаў цеплазабеспячэння населеных пунктаў з пераводам жылых памяшканняў з цэнтралізаванага на індывідуальнае цеплазабеспячэнне. Аднак калі гэтую схему можна выкарыстаць пры дэцэнтралізацыі цеплазабеспячэння ведамасных ці камунальных жылых дамоў (кватэр), дык застаецца адкрытым пытанне аб магчымасці накіравання бюджэтных сродкаў на набыццё і ўсталяванне індывідуальных прыстасаванняў для ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жылых дамах, што належаць грамадзянам на праве прыватнай уласнасці. У многіх выпадках уладальнікі індывідуальных жылых дамоў (кватэр) пенсійнага ўзросту або якія адносяцца да катэгорый малазабяспечаных адзінокіх грамадзян не ў стане забяспечыць перавод свайго жылля на індывідуальнае цеплазабеспячэнне нават на ўмовах ільготнага крэдытавання.

Гэтыя дзеянні, як правіла, матывуюцца неабходнасцю рэалізацыі патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы» ў частцы забеспячэння да 2010 года цяплом аднакватэрных і блакіраваных жылых дамоў за кошт усталявання ў іх індывідуальных прыстасаванняў для ацяплення і гарачага водазабеспячэння — пры аптымізацыі схемаў цеплазабеспячэння населеных пунктаў, што маюць цэнтралізаванае вода- і газазабеспячэнне жыллёвага фонду.

Дырэктыва № 3 з'яўляецца дакументам, у якім вызначаны асноўныя накірункі эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў і энергетычнай бяспекі дзяржавы, рэалізацыя якіх павінна праводзіцца ў строгай адпаведнасці з дзейнымі заканадаўчымі і нарматыўнымі актамі.

Таму на падставе рэкамендацый Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і МОУП «Упраўленне ЖКГ», **з улікам выкладзенага, а таксама маёмаснага і сацыяльнага стану ўладальнікаў кватэр, ацэнкі на месцах тэхнічнай магчымасці і неабходнасці пераводу дамоў на індывідуальнае цеплазабеспячэнне сёлета па многіх індывідуальных спажыўцах была перагледжана сітуацыя і прыняты рашэнні аб падаўжэнні іх цэнтралізаванага цеплазабеспячэння** (выдз. — ***Рэд.***). Спажыўцам жа, адключэнне дамоў якіх ад цэнтралізаванага цеплазабеспячэння тэхнічна магчыма і мэтазгодна, рэкамендуецца прыняць адпаведныя рашэнні. У гэтым кантэксце неабходна адзначыць, што **патрабаваннямі арт. 517 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь № 218 ад 07.12.1998 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі, якія ўвайшлі ў сілу з 01.07.2008 г.) прадугледжваецца, што перапынак у падачы, спыненні ці абмежаванні падачы энергіі (у тым ліку цеплавой) спажыўцам дапускаецца толькі па пагадненні бакоў, за выключэннем выпадкаў аварый і пагрозы жыццю і бяспецы грамадзян** (выдз. — ***Рэд.***).

**Мінскаму райвыканкаму і КУП «ЖКГ Мінскага раёна» рэкамендавана надалей праводзіць мерапрыемствы па дэцэнтралізацыі схемаў цеплазабеспячэння населеных пунктаў з пераводам аднакватэрных і блакіраваных жылых дамоў на індывідуальныя крыніцы цяпла з улікам патрабавання заканадаўчых і нарматыўных прававых актаў, з прапрацоўкай пытанняў фінансавання работ з розных крыніц (сродкі насельніцтва, ільготныя крэдыты, сродкі мясцовых бюджэтаў і прадпрыемстваў), а таксама з абавязковым правядзеннем папярэдняй растлумачальнай працы па пытаннях эканамічнай мэтазгоднасці і тэхнічнай неабходнасці пераводу дамоў (кватэр) на індывідуальнае цеплазабеспячэнне, кошту абсталявання, праектных і мантажных работ, прыцягнення крэдытных сродкаў, парадку выканання работ і адміністрацыйных працэдур** (выдз. — ***Рэд.***).

## На слыху

### РАБОЧЫ ЎПАЎ НА ШТЫР

**Днём у Мінску на тэрыторыі жылога дома, што будуецца, загінуў рабочы філіяла аднаго з прадпрыемстваў.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, няшчасны выпадак адбыўся каля паловы другой дня на перасячэнні вуліц Бурдзейнага і Адзінцова, дзе ідзе будоўля дома. 43-гадовы мужчына па неасцярожнасці ўпаў на штыр і загінуў на месцы. Цяпер праверкай гэтага факта займаецца пракуратура Фрунзенскага раёна сталіцы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «РАЗБАГАЦЕЎ»...

**Буйная сума грошай, на якую разбагацеў жыхар Навагрудка, не прынесла яму дабрабыту, больш за тое, стала прычынай сур'ёзных непрыемнасцяў, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

На працягу двух гадоў вадзіцель і матэрыяльна-адказная асоба падаваў наймальніку фальшывыя дакументы аб пражыванні ў гасцініцах і выплаце экалагічных збораў. Усё гэта пазначалася ў авансавых справаздачах, а ўвогуле мужчына завалодаў амаль 18 мільёнамі рублёў.

Вынік — крымінальная справа па артыкуле «Прысваенне альбо растрата», які прадугледжвае ад двух да сямі гадоў пазбаўлення волі, прычым не выключана і канфіскацыя маёмасці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ЗВАЛІЎСЯ З 9-ГА ПАВЕРХА

**У Пінску чалавек спрабаваў пералезці з суседскага балкона на свой і не ўтрымаўся, сарваўся і... загінуў.**

Што прымусіла 47-гадовага мужчыну так выпрабоўваць лёс, цяпер у яго не спытаеш.

**Яна СВЕТАВА.**

**ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД ОТОПИТЕЛЬНОГО ОБОРУДОВАНИЯ»**

Акционерное Общество информирует владельцев акций Общества о том, что выплата дивидендов за 2006 год началась с 7 августа 2009 года во Фрунзенском отделении ОАО «БПС-Банка» по адресам:

**220073 г. Минск, ул. Тимирязева, 29, РКЦ (т. 204 30 69)**
**220073 г. Минск, ул. Гусовского, 6 (т. 252 45 27)**
**220015 г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (т. 252 39 49)**

**Справки по телефону 203 28 38.**

**Наблюдательный совет.** УНП 100008064

**Вниманию акционеров ОАО «КАТЭК»**

**ОАО «КАТЭК» сообщает о покупке акций собственного выпуска на внебиржевом рынке на следующих условиях:**

**Цена** — 50 $ за 1 акцию (оплачивается в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты).

**Срок оплаты** — в течение 30 календарных дней с даты приобретения акций.

**Количество** — 20 200 акций.

**Срок подачи предложений о продаже** (дата окончания покупки акций) — 30 календарных дней с даты опубликования.

**Адрес для подачи предложений о продаже** — г. Минск, ул. Инженерная, 22 — 304. УНП 808001233

**Міністэрства інфармацыі выказвае глыбокае спачуванне кансультанту ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Шычко Анатолю Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
**220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А**

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00 тел. приемной 227 78 70, тел.: 227 52 36, 226 03 01, 227 50 64.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2007 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

**Объединение осуществляет строительство 12-этажного 3-секционного 162-квартирного жилого дома № 4 (по генплану) со встроенными помещениями общественно-бытового назначения по пр. Независимости в микрорайоне Уручье-3 в г. Минске.**

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций. На первом этаже запроектированы нежилые помещения. Количество жилых помещений жилого дома – 162, общая площадь нежилых помещений – 1414,36 кв.м.

Начало строительства – сентябрь 2008 года

Окончание строительства – январь 2010 года

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:
- государственную экспертизу от 04.12.2007 года № 2690-5/07,
- государственную экологическую экспертизу 20.04.2007 года № 02-11/234.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 01.07.2008 г. № 500/986-221.

Земельный участок площадью 0,3316 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Стоимость строительства 1 м2 жилых помещений в текущих ценах составляет – 3 614 970 бел. руб.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – январь 2010 года.

Договор строительного подряда от 25.07.2008 года № 53.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, 106, 311, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор** **А.П. Парфянович**

**г. ВИТЕБСК** **08.09.2009**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Объекты производственной базы, расположенные по адресу: Витебская область, Докшицкий район, Крулевщинский с/с, д. Крулевщина, и право заключения договоров аренды земельных участков | <u>Характеристика объектов недвижимости:</u><br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16653 **(здание конторы)**, кирпичное двухэтажное, 1978 г.п., общ. площадь 421,1 кв.м, объём 1548 куб.м, фундамент бутовый, перекрытия ж/бетонные, крыша совмещенная рулонная; асфальтовое покрытие, площадь 902,46 кв.м, асфальтовая дорожка, площадь 63,54 кв.м, бордюр (бетонные борт), ворота сварные металлические на металл. столбах;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16654 **(здание гараж-мастерская)**, кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 599,8 кв.м, объем 4217 куб.м, фундамент ж/бетонный, перекрытие бетонное, крыша совмещенная;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16655 **(здание гаражи, проходная)**, кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 78,3 кв.м, объем 415 куб.м, фундамент бутовый, перекрытие ж/бетонное, крыша совмещенная, рулонная, забор металл. на металл. столбах, длина 11,5 м;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16656 **(здание материального склада)**, одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 296,0 кв.м, объем 873 куб.м, фундамент бутовый, наружные стены кирпичные, дощатые, шиферные, крыша шиферная; асфальтобетонная площадка, площадь 840 кв.м, забор ж/бетонный на ж/бетонных столбах, площадь 385 кв.м;<br>- капитальное строение с инв. № 232/С-16673 **(навес)**, шиферное одноэтажное, 1979 г.п., площадь 280,5 кв.м, объем 1562 куб.м, фундамент бутовый, крыша шиферная;<br>- сооружение с инв. № 232/С-17532 (сооружение специализированное коммунального хозяйства – **наружная канализация**), протяженность 209,89 м;<br>- сооружение с инв. № 232/С-17533 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – **наружный водопровод**), протяженность 197,68 м;<br>- **зеленые насаждения:** каштан – 2 шт., клен – 1шт., сирень – 1 шт., туя – 3 шт.<br><u>Земельные участки:</u> срок аренды 99 лет, кадастровый номер 222183005101000561 под здание конторы, площадь 0,2041 га и кадастровый номер 222183005101000562 под объекты производственной базы, площадь 0,6428 га. Использование – под объект общественного назначения. | 345577333 | 34557733 |
| 2 | Здание электромонтажной мастерской с охранно-пожарной сигнализацией, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, промышленная зона, и право заключения договора аренды земельного участка | <u>Характеристика объекта недвижимости:</u> капитальное строение с инв. № 252/С-4667, кирпичное одноэтажное, 1971 г.п., общ. площадь 635,06 кв.м, объем 3997 куб.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/бетонные плиты, крыша рулонная; охранно-пожарная сигнализация (инв. № 048008).<br><u>Земельный участок:</u> с кадастровым номером 241800000009002181 для содержания и обслуживания здания электромонтажной мастерской и подъезда к нему, площадь 0,2747 га, срок аренды 20 лет. Использование – под объект административного, производственного, коммунально-хозяйственного назначения. | 122460732 | 12246073 |
| 3 | Здание клуба, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Клюковский с/с, д. Софиевка, д. 29, и право заключения договора аренды земельного участка | <u>Характеристика объекта недвижимости:</u> капитальное строение с инв. № 240/С-30337 (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), бревенчатое одноэтажное, 1969 г.п., общ. площадь 94,4 кв.м, объем 371 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная.<br><u>Земельный участок:</u> с кадастровым номером 223682706101000025 для содержания и обслуживания клуба, площадь 0,0222 га, срок аренды 50 лет. Использование – для специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения. | 54501755 | 5450175 |

<u>ОРГАНИЗАТОР</u> – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

<u>ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:</u> Лот № 1 – Производственное республиканское унитарное предприятие «Строительно-монтажный трест «Белтопливострой», телефон (017) 508 02 89; Лот № 2 – Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго», телефоны: (0212) 47 30 75, 47 40 22; Лот № 3 – Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, телефон в г. Витебске (0212) 36 98 21.

<u>АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА:</u> Лот № 1 – Докшицкий райисполком; Лот № 2 – Новополоцкий горисполком; Лот № 3 – Оршанский райисполком.

**Условия пользования земельным участком:**

Лот № 1: заключение победителем аукциона с райисполкомом договоров аренды земельных участков и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельных участков государственной регистрации права на земельные участки; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 2: заключение победителем аукциона с Новополоцким горисполкомом договора аренды земельного участка и в двухмесячный срок после его заключения осуществление государственной регистрации прав на земельный участок; получение победителем аукциона, в случае изменения назначения недвижимого имущества (электромонтажной мастерской), в установленном порядке разрешения Новополоцкого горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 3: заключение победителем аукциона с Клюковским сельисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**1. Аукцион состоится «08» сентября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

**Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 07.09.2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 08.09.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. **Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения гор(рай)исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения гор(рай)исполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

# ДА «Белрэсурсы» гатова дапамагчы разгрузіць складскія запасы гатовай прадукцыі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Неабходна адзначыць, што ў першую чаргу адкрыццё гандлёвых дамоў аб'яднаннем накіравана на аказанне дапамогі беларускім вытворцам у пытаннях рэалізацыі сваёй прадукцыі на экспарт, — адзначыў «Звяздзе» **намеснік генеральнага дырэктара «Белрэсурсаў» Канстанцін ТАБАЛА**. — І многія з іх на працягу апошніх гадоў паспяхова супрацоўнічаюць з гандлёвымі дамамі аб'яднання ў гэтым кірунку. Так, праз гандлёвы дом у Арменіі паспяхова прадаюць сваю прадукцыю ААТ «ФанДАК», ААТ «Барысаўдрэў», ААТ «Рэчыцадрэў», ЗАТ «Пінскдрэў», ААТ «Мастыдрэў», у гандлёвы дом у Кыргызстане пастаўляецца прадукцыя ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат», ААТ «Бабруйскхлебмаш», гандлёвыя дамы ў Маскве і Маскоўскай вобласці паспяхова рэалізоўваюць беларускія малочныя прадукты і іншыя прадукты харчавання многіх беларускіх вытворцаў.



ДА «Белрэсурсы» і арганізацыі, што ўваходзяць у яго склад, у 2008 годзе з'яўляліся заснавальнікамі 10 сумесных замежных гандлёвых дамоў з доляй беларускага капіталу, з якіх 7 было створана ў Расійскай Федэрацыі і 3 у краінах СНД. За 2008 год названымі гандлёвымі дамамі рэалізавана беларускай прадукцыі на 6,1 млн долараў ЗША.

У 2009 годзе аб'яднаннем працягнута работа па стварэнні новых суб'ектаў тавараправоднай сеткі за мяжой. Адкрыты новыя гандлёвыя дамы ў Маскоўскай і Калужскай абласцях Расіі, ва Украіне і ў Кыргызстане. У І паўгоддзі 2009 года праз тавараправодную сетку рэалізавана беларускай прадукцыі больш чым на 3,1 млн долараў ЗША, што ў 2,6 раза больш, чым у І паўгоддзі 2008 года.

Апошнім часам наш падыход да стварэння гандлёвых дамоў за межамі рэспублікі істотна змяніўся. Колькасць такіх прадпрыемстваў — не самамэта. Куды больш важная іх якасць. Таму мы імкнёмся супрацоўнічаць толькі з сур'ёзнымі партнёрамі, якія маюць адпаведную матэрыяльную базу, капітал, дзелавы імідж... Толькі калі стварэнне новага прадпрыемства абгрунтаванае, мае дакладную праграму развіцця, мы ўваходзім у бізнэс. У мэтах аператыўнага і рэальнага кіравання доля ДА «Белрэсурсы» і яго арганізацый у статутным фондзе створаных гандлёвых дамоў складае не менш за 50 працэнтаў.




Так, прыкладам паспяховай работы па рэалізацыі беларускай прадукцыі з'яўляецца ААТ «ГД «БелБогПродВпрок» у горадзе Электрасталь Маскоўскай вобласці з доляй беларускага капіталу 75 працэнтаў. Толькі з пачатку гэтага года таварыства паставіла на расійскі рынак прадукцыі харчавання амаль на 1,9 млн долараў ЗША. Гэта дазволіла ў І паўгоддзі 2009 года павялічыць аб'ём пастаўкі беларускай прадукцыі праз гандлёвыя дамы аб'яднання больш як удвая ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

У мэтах дыверсіфікацыі экспарту з удзелам аб'яднання ў чэрвені зарэгістраваны гандлёвы дом ва Украіне — у Жытоміры. Заснавальнікам прадпрыемства з украінскага боку выступае буйная гандлёвая арганізацыя ААТ «Полесьепродторг». Гэта салідная паспяховая фірма, якая акрамя таго мае сетку ўласных баз і складскіх памяшканняў. Напрыклад, толькі з пачатку года «Полесьепродторг» закупіла беларускай прадукцыі на 5 млн долараў ЗША, у тым ліку аб'яднанне паставіла ў гэты адрас беларускіх прадуктаў харчавання на суму 1,24 млн долараў. У ІІ паўгоддзі пастаўкі беларускай прадукцыі ва Украіну плануем значна павялічыць.

Аб'яднанне таксама разглядае пытанне аб увахожданні ўжо сёлета ў склад заснавальнікаў гандлёвага дома ў Сербіі, аб адкрыцці 2 гандлёвых дамоў ва Украіне, гандлёвага дома ў Санкт-Пецярбургу.

***— Канстанцін Браніслававіч, у чым у такім разе прычына невысокіх аб'ёмаў рэалізацыі беларускай прадукцыі праз гандлёвыя дамы «Белрэсурсаў»? Што перашкаджае павелічэнню экспарту ў Расійскую Федэрацыю?***

> «Агульны аб'ём знешнегандлёвага абароту ДА «Белрэсурсы» за студзень—чэрвень 2009 года (паводле аператыўных звестак) склаў 67 019,5 тыс. долараў ЗША, у тым ліку экспарт — 5 982,8 тыс. долараў ЗША, імпарт — 61 036,7 тыс. долараў ЗША».

— Праблемнымі пытаннямі ў дзейнасці існуючай тавараправоднай сеткі ДА «Белрэсурсы» з'яўляецца тое, што ліквідная экспартная прадукцыя рэалізоўваецца самімі прадпрыемствамі-вытворцамі, ці праз іх уласную тавараправодную сетку ў адпаведнасці з даведзенымі міністэрствамі і канцэрнамі планавымі заданнямі. Арганізацыям ДА «Белрэсурсы» і гандлёвым дамам, створаным пры іх удзеле, на рэалізацыю прапаноўваецца ў асноўным прадукцыя, якая не здольная канкурыраваць і не карыстаецца попытам на замежных рынках. Само аб'яднанне не мае ўласнай экспартнай прадукцыі і матэрыяльна-тэхнічнай базы для яе вытворчасці, а таксама паўнамоцтваў дзяржаўнага пасрэдніка пры пастаўках тавараў на экспарт. Таму меры, якія прымаюцца ДА «Белрэсурсы» па эфектыўным функцыянаванні створаных з яго ўдзелам суб'ектаў тавараправоднай сеткі за мяжой, не заўсёды прыводзяць да жаданага выніку.

Што датычыцца Расіі, то варта адзначыць, што найсур'ёзнейшым тормазам росту экспарту працягвае заставацца абсалютна нелагічны, некарэктны з прававога пункту гледжання парадак выплаты падатку на дабаўленую вартасць. Цяпер экспарцёр з'яўляецца закладнікам магчымых праблем з выплатай ПДВ у пакупніка. Так, калі па нейкіх прычынах пакупнік не заплаціў ці не пацвердзіў выплату ПДВ, то гэты абавязак перакладваецца на прадаўца. У гэтых умовах адны кіраўнікі рызыкуюць і чакаюць пацвярджэння, іншыя патрабуюць закладнай сумы ад пакупніка, а трэція проста адмаўляюцца займацца экспартам у Расію. Паводле нашага меркавання, неабходна тэрмінова змяніць такі парадак. У якасці першага кроку можна прапанаваць прымаць да заліку ПДВ па пацвярджэнні факта адгрузкі па накладных чыгункі, аўтаперавозчыка і фірмы-атрымальніка.

***— Імпарт тавараў складае 99,0 працэнта ў агульным аб'ёме імпарту аб'яднання. Што менавіта завозіцца ў рэспубліку?***

— У структуры імпарту асноўны аб'ём (каля 93 працэнтаў) прыпадае на тавары, якія не вырабляюцца ў рэспубліцы або вырабляюцца ў недастатковай колькасці і адносяцца да крытычнага імпарту. Сярод іншага гэта чорныя металы і вырабы з іх (74 працэнты); папера і кардон (2,4 працэнта); хімічная прадукцыя (8 працэнтаў); пластмасы і вырабы з іх (7 працэнтаў); алей сланечнікавы (1,4 працэнта).

Асноўную долю ў агульным аб'ёме імпарту складаюць тавары, дзяржаўным каардынатарам абароту якіх з'яўляецца ДА «Белрэсурсы», а асноўнымі пастаўшчыкамі — арганізацыі, якія ўваходзяць у яго склад, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.12.2003 № 1615.

***— Якая геаграфічная структура імпарту і экспарту тавараў на сёння?***

— У студзені-маі па імпарце мы працавалі з дзевяццю краінамі свету. Асноўны аб'ём паставак тавараў арганізацыямі аб'яднання ажыццяўляўся з Расійскай Федэрацыі (73,8 працэнта) і Украіны (21 працэнт). Астатні аб'ём імпарту прыпадае на Літву, Казахстан, Польшчу, Кітай, Германію, Злучанае Каралеўства Вялікабрытанія, Швецыю.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**
**Дзейнасць ДА «Белрэсурсы» на 90 працэнтаў знешнеэканамічная. Агульны аб'ём знешнегандлёвага тавараабароту арганізацый, якія ўваходзяць у аб'яднанне, за 2008 год склаў каля 1 трлн беларускіх рублёў.**

У той жа час структуры аб'яднання ў студзені-маі 2009 г. экспартавалі тавары ў больш як сем краін свету. Асноўны аб'ём экспарту прыпадае на Расійскую Федэрацыю (52,3 працэнта) і Украіну (32,1 працэнта). Астатнія пастаўкі прадукцыі беларускіх вытворцаў ажыццяўляюцца ў Туркменістан, Латвію, Кыргызстан, Германію, Балгарыю і ў некаторыя іншыя дзяржавы.

Асоба хацеў бы адзначыць, што ў рамках выканання «Праграмы развіцця дзяржаўнага гандлёва-вытворчага аб'яднання «Белрэсурсы» на 2007—2010 гады», зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11.09.2007 № 1157, іншых пастаноў і даручэнняў Урада Рэспублікі Беларусь і Міністэрства гандлю намі прымаюцца меры па нарошчванні экспарту тавараў беларускіх вытворцаў на знешнія рынкі. Але ёсць і праблемы. У прыватнасці, большасць беларускіх вытворцаў, нягледзячы на даручэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб пастаўках тавараў ДА «Белрэсурсы» для наступнай адгрузкі на экспарт па адпускных цэнах для нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь (экспартных цэнах) і прадастаўленне аптовых скідак, не выдзяляюць прадукцыю на такіх умовах па заяўках арганізацый аб'яднання. Такая пазіцыя вытворцаў не зразумелая пры тым, што адзначаецца значны рост складскіх запасаў гатовай прадукцыі. Усё ж мы спадзяёмся на разуменне калег, і выкананне імі сваіх абавязкаў.

У такой няпростай сітуацыі мы пайшлі па шляху больш цеснага супрацоўніцтва з вядучымі прамысловымі міністэрствамі і аблвыканкамамі. Заключаны адпаведныя доўгатэрміновыя рамачныя пагадненні аб супрацоўніцтве, што нам істотна палягчае работу з канкрэтнымі канцэрнамі і прадпрыемствамі. Аднак не ўсе міністэрствы па незразумелых прычынах ідуць нам насустрач. Так, дагэтуль не ўдаецца наладзіць супрацоўніцтва з Міністэрствам прамысловасці. Спасылаюцца на наяўнасць уласнай тавараправоднай сеткі. Аднак у сённяшніх умовах гэтага недастаткова. Крызіс унёс істотныя карэктывы, і каб паспяхова працаваць сёння, трэба дыверсіфікаваць самі формы работы. Што я маю на ўвазе? Чысты, прамы экспарт — на што разлічваюць вытворцы — сёння магчымы не заўсёды. Не ва ўсіх замежных партнёраў цяпер ёсць жывыя грошы, крэдытныя рэсурсы. І ў той жа час вытворчасць працуе, патрэба ў пэўнай прадукцыі ёсць. У такой сітуацыі як выйсце можна выкарыстаць схему сустрэчных паставак без выкарыстання грошай. Напрыклад, Чалябінскі трактарны завод гатовы паставіць нам патрэбныя ў Беларусі запчасткі, а ў залік узяць не грошы, а прадукцыю «Белшыны» і нават прадукты харчавання. Той жа «Белшыне» самой звязвацца з нейкімі запчасткамі няма сэнсу. А мы на такіх схемах «сабаку з'елі». Больш за тое, з падобнымі прапановамі ў расійскіх рэгіёнах мы праз федэральныя структуры выходзім на ўзровень губернатараў і імкнёмся цэнтралізаваць работу. Напрыклад, Беларусі патрэбен метал — гэта крытычны імпарт і ад яго мы нікуды не дзенемся. Аднак разлічыцца за яго не валютай, а айчыннай прадукцыяй — будуць гэта прадукты харчавання, МАЗы, БелАЗы і г.д. — дзяржаве выгадна. Таму і надалей плануем працаваць у гэтым кірунку і ў тым ліку і за кошт гэтага фактара ў найбліжэйшы час значна нарасціць аб'ёмы экспарту беларускіх тавараў. У гэтым кірунку ў «Белрэсурсаў» канкурэнтаў фактычна няма. Іншая рэч, што, на жаль, не з усімі беларускімі вытворцамі ўдаецца знайсці паразуменне.

***— Канстанцін Браніслававіч, у сярэднім па рэспубліцы падзенне экспарту прадукцыі склала каля 50 працэнтаў. Як ідуць справы ў вашага аб'яднання?***

— Зніжэнне пакупной здольнасці нашых замежных партнёраў, натуральна, паўплывала і на нашу работу — «Белрэсурсы» страцілі каля 35 працэнтаў экспарту. Аднак панічных настрояў няма — працуем вельмі актыўна. Цяпер ёсць усе перадумовы да таго, што па выніках 2009 года аб'яднанне не толькі ліквідуе адставанне, але і значна перавысіць паказчык мінулага года.

**Гутарыў**
**Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.**

## ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ І ПРАДПРЫМАЛЬНЫХ БОЛЬШАЕ

**У выніку захадаў, што робяцца Урадам Беларусі па паляпшэнні дзелавога клімату, сёлета ў першым паўгоддзі ў краіне назіралася станоўчая дынаміка па росце колькасці суб'ектаў малога прадпрымальніцтва.**

Так, паводле звестак Мінэканомікі і Міністэрства па падатках і зборах, на пачатак ліпеня ў рэспубліцы знаходзілася на ўліку 72 204 суб'екты малога прадпрымальніцтва — юрыдычных асобаў. Калі параўноўваць гэтую лічбу з аналагічным перыядам мінулага года, то колькасць юрыдычных асобаў — суб'ектаў малога прадпрымальніцтва — павялічылася на 11 634, ці больш як на 19 працэнтаў, а ў параўнанні з пачаткам гэтага года — на 5784, ці амаль на 9 працэнтаў.

Што датычыцца колькасці індывідуальных прадпрымальнікаў, то на 1 ліпеня іх было 216 411 чалавек: да ўзроўню 1 ліпеня 2008 года колькасць ІП павялічылася на 1107 чалавек, ці на 0,5 працэнта, у параўнанні з іх колькасцю на пачатак года — узрасла на 827 чалавек, ці на 0,4 працэнта.

Удзельная вага паступленняў плацяжоў у бюджэт ад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва за шэсць месяцаў гэтага года склала 16,7 працэнта, у тым ліку ад юрыдычных асобаў — 14,2 працэнта, ад індывідуальных прадпрымальнікаў — 2,5.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## У МІНСКУ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ КОЛЬКАСЦЬ КРЭМАЦЫЙ

Усё часцей мінчане замест традыцыйнай працэдуры пахавання выбіраюць крэмацыю памерлых сваякоў. «Колькасць крэмацый у Мінску ў апошнія гады значна павялічылася. Сёння на крэмацыі прыпадае каля 45 працэнтаў ад усіх пахаванняў, якія ажыццяўляюцца», — паведаміў **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Спецыялізаванага камбіната бытавога абслугоўвання горада Мінска Сяргей ТУР**.

Нябожчыкаў крэміруюць у адзіным у рэспубліцы Мінскім крэматорыі. Урну з прахам забіраюць праз 7 дзён пасля крэмацыі. Па жаданні ўрну можна змясціць у магілу сваяка на могілках або ў калумбарную сцяну. Такія сцены ёсць у Мінскім крэматорыі, на Кальварыйскіх, Заходніх і Усходніх могілках.

Здараецца, што пасля працэдуры крэмацыі родныя не прыходзяць па ўрну з прахам. Так, за апошнія 2—3 гады ў Мінскім крэматорыі такіх урнаў сабралася каля 30. Іх плануецца змясціць у брацкую магілу. Могілак у сталіцы ўсяго — 24. У Калодзішчах, Міханавічах і на Заходніх могілках яшчэ ажыццяўляюцца пахаванні, на ўсіх астатніх толькі падпахаванні. Піянерскія, Ваенныя і могілкі Чырвоная слабада не дзейнічаюць. З часам плануецца адкрыць новыя могілкі ў Фаніпалі, а таксама пашырыць дзейныя Паўночныя могілкі.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,**
*«Мінск—Навіны».*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## МІР або ВАЙНА. Што выберуць суседзі?

**Паколькі гісторыя, пра якую мы збіраемся расказаць далей, на наш погляд, звязана выключна з так званым чалавечым фактарам (калі больш дакладна — узаемаадносінамі паміж суседзямі), прозвішчы галоўных дзейных асобаў канфлікту і дакладнае месца, дзе ён пачаў разгортвацца, называць не будзем. А сутнасць яго, паводле слоў аднаго з зацікаўленых бакоў, у наступным.**

Жылі побач суседзі. На ўчастку адных расло дрэва. Вялікая галінка гэтай яблыні фактычна ляжала на даху дома другіх. З-за гэтага той самы дах пачаў падгніваць, гэта па-першае. Па-другое, сёлета на старой яблыні было шмат пладоў. А ў сям'і людзей, якім належаў дом, нядаўна нарадзілася дзіця. І ўвесь час падалі яблыкі, што пачалі дастаўляць непрыемнасці сваім шумам. Дамовіцца па-суседску, як расказаў па «гарачым тэлефоне» адзін з прадстаўнікоў бакоў — сын пажылой гаспадыні дома — не атрымалася: яго маці быццам бы ніхто не стаў слухаць. А яблыкі тыя, працягваў мужчына, нікому не патрэбныя. Людзі, якія жывуць за суседняй агароджай, збіраюць іх і проста выкідваюць. Не даўшы рады, сын гаспадыні дома пісьмова ў мінулы панядзелак звярнуўся ў сельскі Савет, маўляў, дапамажыце вырашыць сітуацыю.

— І вось пайшоў ужо другі тыдзень, а ніякага адказу я не бачыў, не тое што вырашэння самой канфліктнай сітуацыі. Хіба за такі тэрмін нельга было ўсё вырашыць? — пытаўся у нас заяўнік.

— Давайце пачнём з таго, — парыравала ў гэтай завочнай размове з заяўнікам **старшыня Міханавіцкага сельскага Савета Мінскага раёна Святлана ДАВАЛЬЦОВА**, — што мужчына звярнуўся да нас 27 ліпеня. Значыць, тэрмін у 15 дзён, які адводзіцца на тое, каб даць адказ на запыт грамадзяніна, яшчэ не скончыўся. Гэта па-першае. Падругое, і вусна і пісьмова вашаму заяўніку адказ быў дадзены. Зыходны ліст быў пазначаны 30-м чыслом, так што грамадзянін павінен яго ў любым выпадку атрымаць, не лічачы вуснага адказу.

Паводле далейшых слоў Святланы Уладзіміраўны, у згаданым адказе гаварылася, што другі бок канфлікту — суседзі заяўніка — запрошаны для размовы ў сельскі Савет літаральна на 5 жніўня. Чаму вызначаны менавіта такі тэрмін?

— Вы ж зразумейце, людзі з'ехалі ў Мінск, ім таксама патрэбны час, каб удакладніць свае справы, змяніць планы, — патлумачыла Святлана Давальцова.

Папярэдне, яшчэ да згаданай сустрэчы, можна сказаць, што суседзі заяўніка пагаджаюцца з абгрунтаванасцю яго скаргі. Адпаведна, маюць намер спілаваць тую самую галінку яблыні. А з іншага боку — збіраюцца падаць ...уласную скаргу на гэтага грамадзяніна. За тое, што той на сваім участку трымае вуллі і пчолы дастаўляюць ужо ім шмат непрыемнасцяў. Аднак, падкрэслім яшчэ раз, гэта папярэдняя інфармацыя. Пра больш падрабязную можна будзе гаварыць толькі пасля таго, як ўсе бакі канфлікту — зацікаўленыя і тыя, што мусяць выступаць у ролі трацейскага суддзі — сустрэнуцца за адным сталом перамоваў. Напэўна, шмат залежыць, ад таго, ці здолеюць зрабіць крок насустрач адзін аднаму суседзі. З той жа яблыняй, як падаецца, праблема ўзнікла не сёння: дрэва ж не за адно лета так вырасла. Пэўна ж, і пчол другі гаспадар не ўчора на ўчастку завёў. Як высветлілася ўскосна, паміж людзьмі праблемы і прэтэнзіі адзін да аднаго на гэтым не вычарпаны...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**
**220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А**

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00
тел. приемной 227 78 70, тел.: 227 52 36, 226 03 01, 227 50 64.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2008 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д.10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (жилой дом № 19)» в г. Минске.**

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций. Количество жилых помещений жилого дома – 116.

Начало строительства – июль 2009 года.

Окончание строительства – февраль 2010 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

- государственную экспертизу от 07.07.2009 года № 0752-2009.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 08.06.2009 г. № 500/962-1616.

Земельный участок площадью 0,62 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Стоимость строительства 1 кв. метра жилых помещений в текущих ценах составляет 2 299 780 рублей для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, и 2 518 810 рублей для граждан, не состоящих на таком учете.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 20.07.2009 № 5С-07-2009.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**И.о. генерального директора В.С. Василевич**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**
**проводит 14-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 15 сентября 2009 года**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч, (износ) | Начальная цена продажи партии, (руб.) | Сумма задатка, (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 41. | Комплект элементов металлоконструкций СРМ-10,8хОН, 4 кат. | Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи | 1986 | 60 % | 22 000 000 | 2 200 000 |
| 42. | Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат. — 100 шт. | Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи | 1989 | 41 % | 41 000 000 | 4 100 000 |
| 43. | Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат. — 50 шт. | Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи | 1989 | 41 % | 20 500 000 | 2 050 000 |
| 44. | Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат. — 50 шт. | Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи | 1989 | 41 % | 20 500 000 | 2 050 000 |

**Аукцион** состоится в 11.00 **15 сентября 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 11 сентября 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **15 сентября 2009 года.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: р/с 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

**Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15.**
**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

# СТАЎКІ ПА ВАЛЮТНЫХ ДЭПАЗІТАХ СЁЛЕТА БОЛЬШ НЕ ЗНІЗЯЦЦА...

Грошы

**Прынамсі, Нацыянальны банк не мае намеру даваць рэкамендацыі камерцыйным банкам на гэты конт. Пра гэта паведаміў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел Калаур на сустрэчы з журналістамі ў Мінску, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды». У прыватнасці, ён нагадаў, што галоўны банк краіны ўжо рабіў рэкамендацыі, звязаныя са змяншэннем працэнтных ставак па дэпазітах у замежнай валюце. «Вы ведаеце, — сказаў Павел Калаур, - што гэта 8 працэнтаў гадавых, і, як мы мяркуем, далей да канца года нейкія новыя рэкамендацыі з'яўляцца не будуць».**

Банкір патлумачыў, што 8 працэнтаў гадавых па дэпазітах у замежнай валюце, якія цяпер прапануюць банкі, гэта той узровень, што дазваляе мець нармальны спрэд паміж стаўкамі па рублёвых і валютных укладах, які забяспечвае большую прывабнасць непасрэдна ўкладаў у нацыянальнай валюце. Што ж датычыцца чутак, маўляў, валютныя дэпазіты будуць вяртаць у беларускіх рублях, то каментуючы іх, Павел Калаур быў лаканічны. Паводле яго слоў, рабіць гэтага няма сэнсу. «Праўленнем Нацыянальнага банка, — заявіў ён, — такія пытанні не разглядаліся, не разглядаюцца і разглядацца не будуць, паколькі яны пазбаўленыя ўсялякага эканамічнага сэнсу».

Гаворачы пра тое, што з канца ліпеня ў краіне ўвайшлі ў сілу змяненні ў закон аб гарантаванай кампенсацыі ўкладаў, Павел Калаур падкрэсліў, што ў рэспубліцы завершана фарміраванне заканадаўства, якое накіраванае на стварэнне дадатковых гарантый укладчыкам і забеспячэнне захаванасці грашовых сродкаў. У выпадку, калі ў нейкага банка, напрыклад, будзе адклікана ліцэнзія на працу з укладамі грамадзян, кампенсаваць патэнцыяльныя страты ўкладчыкаў будзе Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў. Між іншым, цяперашні рэзерв агенцтва складае каля 370 мільярдаў рублёў. Гэтых грошай, паведаміў генеральны дырэктар ДУ «Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў» Яўген Еўлашкін, хапіла б на кампенсацыю ўкладаў насельніцтва ў 13 беларускіх банках, гэта значыць у палове з тых, што маюць права на працу з укладамі фізічных асобаў. Пры гэтым ён удакладніў, што маюцца на ўвазе банкі, пачынаючы з 26-га і заканчваючы 13-м месцам. Таксама гэтых сродкаў хопіць, каб кампенсаваць уклады ў адным сярэднім банку, аднак не сістэмаўтваральным. Разам з тым, трэба разумець і тое, што рэзерв агенцтва пастаянна папаўняецца, прычым з некалькіх крыніц. У прыватнасці, штоквартальна банкі пералічваюць 0,3 працэнта ад прыцягнутых дэпазітаў, а агенцтва размяшчае сродкі ў надзейныя крыніцы для атрымання даходу. Да таго ж з наступнага года Нацыянальны банк будзе пералічваць у рэзерв агенцтва 80 працэнтаў прыбытку. Такім чынам, як разлічваюць у агенцтве, на працягу двух гадоў яго рэзерв дасягне каля 800 мільярдаў рублёў.

Як вядома, цяпер укладчыкам гарантуецца 100-працэнтная кампенсацыя ўкладаў — як у нацыянальнай, так і замежнай валютах. А вось што датычыцца даходаў у выглядзе працэнтаў па ўкладах, то такая кампенсацыя на агенцтва не распаўсюджваецца, гэтую рызыку нясе непасрэдна той, хто давярае грошы таму ці іншаму банку. Праўда, ва ўкладчыка заўсёды ёсць права патрабаваць працэнты ад банка. А ў тым выпадку, калі апошні прызнаецца банкрутам, «то далей ідзе задавальненне патрабаванняў, — зазначыў Павел Калаур. — Укладчыкі адносяцца да першай групы для задавальнення патрабаванняў, і пасля таго, як будзе распрададзена маёмасць банка, яны могуць атрымаць свае працэнты». Такім чынам, каб не трапіць у няёмкае становішча і не чакаць кампенсацыі па працэнтах, пры выбары банка кліент павінен сам аналізаваць фінансавы стан установы. «У большай ступені, ацэньваючы сітуацыю ў банках, людзі павінны звяртаць увагу на наступны момант: калі банкі знянацку пачынаюць вельмі значна завышаць стаўкі па дэпазітах, — папярэджвае Павел Калаур. — Ва ўсе часы ва ўсіх краінах — гэта першы сігнал да таго, што адбываецца штосьці не тое. І ў такім выпадку лепш падстрахавацца, дыверсіфікаваць свае ўклады, альбо скарыстацца паслугамі іншага банка, які не выклікае пытанняў».

Наогул жа, лічыць банкір, для сумненняў і перажыванняў ва ўкладчыкаў падстаў няма. Паводле яго слоў, банкаўская сістэма краіны функцыянуе даволі стабільна, выконваюцца паказчыкі бяспечнага функцыянавання практычна ўсімі банкамі. І калі сёння маюцца выпадкі парушэння асобных паказчыкаў, то гэта, як правіла, кароткатэрміновыя парушэнні паказчыкаў кароткатэрміновай ліквіднасці ў асобных банках, якія ў сваёй аснове ніякім чынам не пагражаюць інтарэсам укладчыкаў. Павел Калаур дадаў, што ўсе беларускія банкі, за выключэннем двух дробных, працуюць з прыбыткамі. Калі ж весці гутарку пра праблемныя актывы, то іх доля цяпер знаходзіцца ў межах 2,5 працэнта, што з'яўляецца добрым паказчыкам у параўнанні з суседнімі краінамі. У Нацбанку прагназуюць, што да канца года доля праблемных актываў не перавысіць 5 працэнтаў, і не прагназуюць у найбліжэйшай будучыні банкруцтва банкаў.

А вось адказваючы на пытанне па магчымай кампенсацыі ўкладаў савецкіх часоў, першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка падзяліўся з журналістамі наконт гэтага асабістым меркаваннем. «Я лічу, — сказаў ён, — цяпер, калі сітуацыя ў сусветнай эканоміцы і нашай эканоміцы даволі складаная, разглядаць пытанне аб дадатковых расходах на кампенсацыю гэтых укладаў трэба крайне асцярожна, з улікам магчымасцяў бюджэту».

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

Сёння — Дзень стварэння органаў фінансавых расследаванняў

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ КАНТРАЛЮЮЧЫХ ОРГАНАЎ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ЎДВАЯ

**Органы фінансавых расследаванняў былі створаны 5 жніўня 1992 года ў структуры Галоўнай дзяржаўнай падатковай інспекцыі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь. А вось у лістападзе 2001 года пачаў сваю дзейнасць дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю. Аб выніках дзейнасці органаў фінансавых расследаванняў КДК у першым паўгоддзі рэдакцыі паведаміў намеснік старшыні КДК, дырэктар дэпартамента фінансавых расследаванняў Сяргей БАРАНОЎСКІ.**

За 6 месяцаў органамі фінансавых расследаванняў было праведзена 1903 праверкі і ўсе яны былі выніковымі. Суразмоўца адзначыў, што ўсе праверкі ажыццяўляліся выключна пры наяўнасці дакладнай інфармацыі аб правапарушэннях па справах аператыўнага ўліку і крымінальных справах, якія знаходзяцца ў распрацоўцы. Адзначаецца якасны рост службовай дзейнасці спецыялістаў. Так, дэпартамент сёлета на 17 працэнтаў скараціў колькасць праверак, сума прад'яўленых да аплаты падаткаў і адміністрацыйных спагнанняў павялічылася на 41 працэнт і за паўгоддзе склала 105,7 млрд рублёў.

— Галоўнай задачай дэпартамента на сённяшнім этапе з'яўляецца абарона інтарэсаў грамадскасці і дзяржавы ад злачынных і іншых супрацьпраўных замахаў у эканамічнай сферы, — расказвае Сяргей Канстанцінавіч. — Другой задачай органаў фінансавых расследаванняў стала абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян нашай краіны.

Спецыялісты дэпартамента адышлі сёння ад «дробязі» і займаюцца галоўным чынам выяўленнем цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, злачынстваў карупцыйнай накіраванасці, спыненнем дзейнасці арганізацыйных груповак і злачынных арганізацый, якія наносяць істотную шкоду эканамічным інтарэсам дзяржаве.

— Цяпер нашы структуры праводзяць праверкі выключна паводле аператыўнай інфармацыі, — кажа дырэктар дэпартамента, і гэтыя праверкі маюць кропкавы характар. У два разы павялічылася эфектыўнасць працы органаў фінансавых расследаванняў у параўнанні з першым паўгоддзем летась. Цяпер паступленні ў бюджэт па выніках адной праверкі склалі 55,6 млн рублёў.

Па выніках аператыўна-службовай дзейнасці органаў фінансавых расследаванняў сёлета было выяўлена 252 цяжкія злачынствы і 3 асабліва цяжкія. У дачыненні да арганізаваных злачынных груп было заведзена 26 крымінальных спраў, 3 справы па злачынных арганізацыях, па злачынствах карупцыйнай накіраванасці заведзена 118 крымінальных спраў.

Напрыклад, у апошнія гады сур'ёзная ўвага работнікаў дэпартамента надаецца сферы незаконнага прадпрымальніцтва. Так, цяпер завершана расследаванне і перададзена ў суд крымінальная справа ў дачыненні да арганізаванай злачыннай групы, у складзе якой былі 3 жыхары Оршы. Яны на працягу 2006—2008 гадоў ад імя падстаўных індывідуальных прадпрымальнікаў, выкарыстоўваючы магчымасць зняцця апошнімі са сваіх рахункаў наяўных грошай, аказвалі незаконныя паслугі юрыдычным асобам па пераводзе безнаяўных у наяўныя грашовыя сродкі. У выніку гэтых незаконных аперацый удзельнікамі арганізаванай групы быў атрыманы даход на суму больш як 25 млрд рублёў.

Па сферы падаткаабкладання ў суд накіравана справа ў дачыненні да чатырох службовых асобаў камерцыйных структур, якія ажыццяўлялі аптовую рэалізацыю нафтапрадуктаў, занізілі атрыманую выручку, у выніку чаго не былі заплачаны падаткі і зборы на суму больш як 11 млрд рублёў. У мэтах забеспячэння кампенсацыі ўрону арыштавана маёмасць камерцыйных структур на суму 8 млрд рублёў і забяспечана паступленне 200 млн рублёў у бюджэт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345 Індэкс 63850. Зак. № 4213. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# ЯК НЕ НАБЫЦЬ ЗАМЕСТ «ЛАСТАЎКІ» «РУСАЛКУ»




**Не цяжка здагадацца, што нагодай для ўзняцця гэтай тэмы ў нашай пастаяннай рубрыцы сталі нядаўнія залевы. Разам з вадой на сотні сталічных і не толькі аўтааматараў абрынулася сапраўднае цунамі праблем, якое перавяло іх верных «жалезных коней» у разрад «тапельцаў». Не трэба быць вялікім экспертам, каб здагадацца, што большасць гаспадароў пастараецца ад іх пазбавіцца ў самым хуткім часе. Аднак не варта забывацца і пра тое, што аўтамабіляў з «падмочанай рэпутацыяй» на беларускіх рынках хапала заўсёды, хоць масава яны выплёскваліся на гандлёвыя пляцоўкі пасля паводак у Еўропе і ўраганаў у ЗША — асноўных пастаўшчыкоў аўтамабільнага сэканд-хэнду ў**




Ніжэй мы пастараемся адказаць на тры, на наш погляд, асноўныя пытанні, звязаныя з валоданнем патанулым аўто:

**1. Ці варта набываць такую машыну?**

**2. Чым гэта можа абярнуцца?**

**3. Як зразумець, што перад вамі «тапелец»?**

Нямецкія спецыялісты высвятлілі, што крытычная кропка затаплення аўто — гэта ніжняя кромка прыборнай панэлі. Пасля такога за рэанімацыю не варта нават брацца. Аднак калі машына была затоплена і значна менш, заспакойвацца не варта — поўнае аднаўленне «тапельца» — не для продажу а для сябе — часта супастаўнае з коштам аўто ў нармальным стане.

Не сакрэт, што вада з пяском і смеццем, змытым з вуліц, выдатны абразіў. І вось гэтая адская сумесь пры затапленні патрапіць ва ўсе негерметычныя вузлы і агрэгаты аўто, у салон, схаваныя поласці кузава... Спачатку разбухне картон і адслоіцца абіўка салона, можа абвіснуць столь... Прасушыць на 100 % кузаў таксама наўрад ці ўдасца, што ўжо ў хуткім часе выкліча «рудую хваробу». Моцна пацерпіць выхлапная сістэма. Аднак самае непрыемнае і небяспечнае тое, што дзясяткі метраў дроту, сотні раз'ёмаў і ўся бартавая электрыка, у тым ліку і так званыя «мазгі» аўтоператвараюцца ў міну замаруджанага дзеяння: ніхто не прадкажа, калі нешта ў выніку акіслення (а яно будзе абавязкова) адмовіць ці нават заіскрыць. Не абысціся і без сур'ёзнай рэанімацыі рухавіка і трансмісіі. Калі вада патрапіла ў матор, то без дарагога рамонту — зняцце ўпускнога і выпускнога калектараў, галоўкі блока цыліндраў, замены масла і фільтраў — заводзіць аўто ні ў якім разе нельга: гідраўдар і разбурэнне рухавіка непазбежныя. Ну і, безумоўна, пясок застанецца ва ўсіх сальніках, падшыпніках і г.д., што ў самым хуткім часе выведзе іх са строю.

Натуральна, прадаўцы канцэнтруюць намаганні на знешнім выглядзе аўто і ліквідацыі непрыемных гніласных пахаў. На сур'ёзны рамонт таго ж рухавіка, замену дроту, электрыкі, змазку ніхто грошы выдаткоўваць не будзе. Вось і вырашайце, ці патрэбная вам такая «русалка».

Пасля таго, як над перапрадажнай падрыхтоўкай «пашаманяць» спецыялісты, адрозніць «тапельца» ад нармальнага аўтамабіля даволі складана. Цана на рынку таксама можа не вельмі адрознівацца, каб не выдаць мокрага мінулага машыны. І ўсё ж такі некалькі парад, як выявіць «русалку», мы дадзім. Калі ж у вас усё адно застаюцца сумненні, лепш разгледзець іншы варыянт пакупкі.

**ЯК РАСПАЗНАЦЬ АЎТАМАБІЛЬ-ТАПЕЛЕЦ?**

Раім рабіць агляд менавіта ў такім парадку.

***Салон***

Непрыемны гніласны ці плесневы пах, асабліва ў багажным аддзяленні. Калі аўтамабіль нагадвае парфумерную фабрыку, значыць гэты пах імкнуцца замаскіраваць.

Разводы ад вады на абшыўцы дзвярэй, крэслах.

Знізу сядзенняў элементы крапяжу са слядамі іржы.

Вільгаць ці вада пад абіўкай падлогі, пясок у скрытых поласцях, пад молдынгамі.

***Оптыка***

Кандэнсат у фарах, задніх фанарах, паваротніках.

Памутнелыя святлоадбівальнікі, разводы на шкле фараў.

Запацелыя фары.

***Электраабсталяванне***

Тут усё проста: калі не працуе хоць адзін электрапрыбор (дворнікі, паваротнікі, зумер, электрарэгуліроўкі і г.д.) — гэта нагода насцярожыцца.

***Тэхнічны стан***

Няроўная работа рухавіка на халастых абаротах, правалы падчас руху.

Яшчэ адна характэрная прыкмета «тапельцаў» — павышаны гул падшыпнікаў усіх навясных агрэгатаў: генератара, помпы, гідраўзмацняльніка руля, кандыцыянера. Утвараецца ён па прычыне вымывання змазкі. Такі гул механік на СТА можа выявіць з дапамогай стэтаскопа.

**КАЛІ ВЫ ПАТРАПІЛІ Ў ПАВОДКУ...**

Спецыялісты раяць не лезці ў вадаёмы невядомай глыбіні і ў залеву не пакідаць машыну ў месцах, якія топіць з году ў год. Калі непазбежнасць затаплення стала відавочнай, адразу глушыце матор. Калі матор заглох падчас фарсіравання воднай перашкоды, ні ў якім разе не спрабуйце запусціць яго зноў! Неадкладна скіньце клему з акумулятара і шукайце магчымасць вызваліць аўто з воднага палону. Чым хутчэй, тым лепш. Верагоднасць аднаўлення працаздольнасці машыны адваротна прапарцыянальная часу яе знаходжання ў вадзе. У «палявых» умовах рэанімаваць сучасны аўто не ўдасца. Да дастаўкі «дайвера» на СТА можна зліць (замяніць) усе тэхнічныя вадкасці, расстыкаваць і прасушыць даступныя электрычныя раз'ёмы.

**КАРЫСНАЯ ПАРАДА**

Ну і апошняе. ГУУС Мінгарвыканкама на сваім сайце вывесіла спіс дзяржаўных рэгістрацыйных аўтамабільных нумароў, якія былі згублены падчас залевы 24 ліпеня ў Мінску. У ім — нумары каля 180 аўто з усіх куткоў Беларусі, таксі і аўтамашын з іншых краін.

Лічым, што гэтая інфармацыя будзе цікавая не толькі аўтааматарам, якія цяпер змогуць вярнуць рэгістрацыйныя знакі, за адсутнасць якіх, дарэчы, можна «патрапіць» на даволі сур'ёзны штраф. Спіс можа аказацца карысным і для тых, хто цяпер падбірае «жалезнага каня». Вядома ж, аўтамабіль перад продажам могуць паставіць і на транзітныя нумары, але робяць гэта далёка не ўсе і не заўсёды. Ды і ў тэхпаспарце на аўтамабіль былыя нумары застаюцца.

**Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.30 | 21.00 | 15.30 |
| Віцебск — | 5.14 | 20.55 | 15.41 |
| Магілёў — | 5.20 | 20.50 | 15.30 |
| Гомель — | 5.22 | 20.41 | 15.19 |
| Брэст — | 5.46 | 21.14 | 15.28 |
| Гродна — | 5.53 | 21.09 | 15.16 |

**Месяц**
*Поўня 6 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**
*Пр. Марыны, Трафіма.*
*К. Караліны, Марыі, Освальда, Станіслава.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## НАДВОР'Е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +23..+24°С | КІЕЎ +26..+28°С | РЫГА +23..+25°С |
| ВІЛЬНЮС +23..+25°С | МАСКВА +21..+23°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С |

## Дзве даты — 5 жніўня



**1907 год** — нарадзіўся Эдуард Самуйлёнак, беларускі савецкі пісьменнік. Вучыўся ў польскай гімназіі горада Пецярбурга. Юнацкія гады правёў на радзіме бацькі, у вёсцы Бандзелі Верхнядзвінскага раёна. Хадзіў пільшчыкам па вёсках, загадваў хатай-чытальняй, быў сакратаром камсамольскай ячэйкі. Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная Полаччына» (1930—1933), «Літаратура і мастацтва» (1934—1939). Першыя вершы і апавяданні Самуйлёнка былі апублікаваны ў канцы 1920-х гадоў. Аўтар апавяданняў і аповесцяў «Дачка эскадрона», «Паляўнічае шчасце», «Тэорыя Каленбрун», «Пункт апоры», п'есы «Пагібель воўка» і іншых твораў. Памёр у 1939 годзе.

**1772 год** — адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй, у выніку якога яна пазбавілася шэрагу важных памежных тэрыторый: да Расіі адышлі Паўднёвая Ліфляндыя з Дынабургам, усходняя Беларусь з Полацкам, Віцебскам і Магілёвам і ўсходняя частка Чорнай Русі (правабярэжжа Заходняй Дзвіны і левабярэжжа Бярэзіны); да Прусіі — Заходняя Прусія (Польскае Памор'е) без Гданьска і Торуня і невялікая частка Куявіі і Вялікай Польшчы (акруга р. Нетцы); да Аўстрыі — большая частка Чырвонай Русі са Львовам і Галічам і паўднёвая частка Малой Польшчы (Заходняя Украіна).

**Цытата дня:**

***«Самы разумны мужчына, закахаўшыся, траціць розум; самая пустая жанчына — разумнее на вачах».***

**Морыц-Готліб Сафір.**

ОРГАНИЗАЦИЯ ПРОДАСТ
АВТОМОБИЛЬ УАЗ-31514
1998 года выпуска,
оценочная стоимость 2 826 530 белорусских рублей.
Справки по телефонам
8 (02155) 41 472, 41 085, 41 192, 42 388,
GSM 8 (029) 354 64 80, 896 37 81.
УНП 300229387

# СІМВОЛІКА НАТУРАЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ

Свет і сусвет чалавека

*Адзін:* Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее. Адзін у полі не воін. Адзін дуб у полі — гэта не лес.

*Два:* Конь з канём, вол з валом, а свіння з вуглом. Хоць вох, ды ўдвох. З мілым і ў шалашы рай.

*Тры:* Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, а толькі тры сыны — сын. Жылі-былі дзед і баба, было ў іх трое ўнукаў.

*Чатыры:* Ідзі на ўсе чатыры бакі.

*Пяць:* Варона з куста, а пяць на куст. Ведае, як свае пяць пальцаў.

*Шэсць:* Жыў-быў Несцерка, было ў яго дзяцей шэсцерка.

*Сем:* Ведае свой род у сёмае калена.

*Восем:* Прыйшла вясна — ужо часу няма, прыйшло лета — бярыся то за тое, то за гэта, надышла восень — яшчэ работ восем.

*Дзевяць:* У трыдзявятым царстве, у трыдзясятым гасударстве.

- Кожная з узгаданых натуральных лічбаў сустракаецца ў пэўных абрадавых ці пазаабрадавых кантэкстах, у міфалагічных, казачных або песенных тэкстах, у малых фальклорных жанрах. Асабліва шырокі сімвалічны код лікаў у чарадзейных казках і казках пра жывёл, у замовах і такіх паэтычных мініяцюрах, як прыказкі і прымаўкі.
- Часцей за ўсё выкарыстанне таго ці іншага ліку абумоўлена светапогляднымі ўяўленнямі нашых продкаў і іх непасрэднай «заземленасцю» ў канкрэтную рытуальна-абрадавую сітуацыю.
- У славянскіх казках самым пашыраным кампазіцыйным прыёмам з'яўляецца трохразовы паўтор. Тры разы бацька абводзіць дачку вакол стала, перад тым як перадаць яе ў рукі жаніха і адправіць маладых да вянца.
- Калі ўзяць за аснову класічны прынцып народнай культуры — супрацьстаянне Дабра і Зла, Жыцця і Смерці, Святла і Цемры, Гармоніі і Хаосу, — то сістэма лікаў, хутчэй за ўсё, павінна мець той самы падзел: адны з іх факусіруюць у сабе філасофію гармоніі жыцця, а іншыя — хаос Смерці.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

Шэсць раніцы. У кругласутачную кветкавую краму заходзіць інтэлігентнага выгляду мужчына, але з відавочнымі прыкметамі бурна праведзенай ночы. Кажа прадаўшчыцы:

— Падбярыце мне букет для жонкі, самы прыгожы.

Потым задумаўся і дадаў:

— І самы мяккі...

☺

**Варажба па лёдзе.**

**У марозную ноч дзяўчына, якая збіраецца варажыць па лёдзе, павінна паліць вадой дарогу перад сваімі варотамі і ўстаць побач з вядром.**

**Дачакаўшыся мінака, яна даведаецца аб сабе шмат цікавага.**

☺

— Тата, а бусел маме ўжо прынёс брацiка?

— Не.

— А-а-а, значыцца нездарма я каля радзільнага дома пудзіла паставіў...

☺

**Самы ўплывовы чалавек пасля карпаратыву — той, у каго фотаздымкі...**



## Крымінал

### КЛЕПТАМАНІЯ?

Упакоўка мяшкоў для смецця тэрмінова спатрэбілася раней судзімаму 25-гадоваму жыхару Светлагорска. Яе ён выкраў непасрэдна з прылаўка. Выкарыстаць набытую «каштоўнасць» грамадзянін не паспеў, мужчыну затрымалі праваахоўнікі і забралі здабычу, — паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама. А ля вёскі Аляксандраўка ў Жлобінскім раёне 19-гадовы раней судзімы юнак, жыхар Рагачоўскага раёна, украў бутэльку віна ў другога грамадзяніна. Выпіць таксама не паспеў. Абодва зладзеі затрыманыя. А вось таго, хто выкраў з лесапаркавай зоны біятуалет у Савецкім раёне Гомеля, міліцыя пакуль шукае. Павінна знайсці — па паху...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



# БЕЛАРУСБАНК

**УТВЕРЖДЕНО**
Наблюдательный совет
ОАО «АСБ Беларусбанк»
08 июля 2009 года
протокол № 14

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАВЕРЕНО**
_______________ А.Л. Гальперин
31 июля 2009 года

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

### об открытой продаже облигаций шестьдесят четвертого и шестьдесят пятого выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента:**

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, телефон – (017) 218-84-08, телефон / факс – (017) 222-26-26, e-mail – info@belarusbank.by.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Уставный фонд Банка составляет 2.288.787.859.000 (Два триллиона двести восемьдесят восемь миллиардов семьсот восемьдесят семь миллионов восемьсот пятьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы Банка за 2008 год опубликована 28 марта 2009 года в газете «Звязда» (№ 58). По итогам работы Банка за 2009 год и последующие годы указанная информация будет опубликована не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

**5. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)**

С более подробной информацией и копией проспекта эмиссии облигаций шестьдесят четвертого и шестьдесят пятого выпусков ОАО «АСБ Беларусбанк», оформленной в установленном порядке, можно ознакомиться визуально в филиалах-областных (Минском) управлениях, филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно *(кроме выходных и нерабочих праздничных дней)* в течение их рабочего времени.

**6. СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖИ ОБЛИГАЦИЙ**

**6.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске 64 и 65 облигационных займов в соответствии с подпунктом 10.2 Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 8 июля 2009 года, протокол № 14.

**6.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций:**

| Номер выпуска | 64 выпуск | 65 выпуск |
|---|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Документарные, на предъявителя, процентные, неконвертируемые | |
| Объем эмиссии | Десять миллиардов белорусских рублей | Десять миллиардов белорусских рублей |
| Количество облигаций | 20 000 штук | 10 000 штук |
| Серия, номера облигаций | ВЕ64 000001-020000 | ВЖ65 000001-010000 |
| Номинальная стоимость | Пятьсот тысяч белорусских рублей | Один миллион белорусских рублей |

**6.3. Цель выпуска облигаций**

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств физических лиц и направления полученных средств на выдачу кредитов для финансирования долгосрочных инвестиционных проектов и строительства жилья в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь и Национального банка Республики Беларусь от 20.06.2006 № 776/10 «О направлении средств, полученных от размещения облигаций некоторых банков путем открытой продажи физическим лицам».

**6.4. Период проведения открытой продажи облигаций**

Открытая продажа облигаций проводится с **01.09.2009 по 28.02.2011**, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

**6.5. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

После опубликования краткой информации об открытой продаже облигаций, заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, открытая продажа облигаций производится Банком на внебиржевом рынке. Открытую продажу облигаций осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

Облигации продаются по их номинальной стоимости в валюте номинала. Владельцами облигаций Банка в период открытой продажи могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности (далее – физические лица).

В оплату облигаций физические лица обязаны внести денежные средства наличными либо перечислить в Банк в безналичном порядке. Денежные средства от открытой продажи облигаций будут поступать на соответствующие балансовые счета 4940, открытые в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка.

**6.6. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций – 730 календарных дней (с 01.09.2009 по – 01.09.2011).

**6.7. Дата начала погашения облигаций**

Дата погашения облигаций – **01.09.2011.**

**6.8. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты**

По облигации установлена доходность в размере ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) **плюс восемь** процентных пунктов.

Выплата дохода по облигации производится периодически **(один раз в три месяца)** в виде купонного дохода при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации в Банк в соответствии с графиком выплаты купонного дохода:

| Номер купонного периода | Начало периода | Конец периода и день начала выплаты дохода | Продолжительность периода, дней |
|---|---|---|---|
| 1 | 01.09.2009 | 30.11.2009 | 90 |
| 2 | 01.12.2009 | 28.02.2010 | 90 |
| 3 | 01.03.2010 | 31.05.2010 | 92 |
| 4 | 01.06.2010 | 31.08.2010 | 92 |
| 5 | 01.09.2010 | 30.11.2010 | 91 |
| 6 | 01.12.2010 | 28.02.2011 | 90 |
| 7 | 01.03.2011 | 31.05.2011 | 92 |
| 8 | 01.06.2011 | 01.09.2011 | 93 |
| | | ИТОГО | 730 |

Начисление купонного дохода осуществляется за период со дня, следующего за днем фактической продажи облигации, по 01 сентября 2011 года включительно (за исключением случаев досрочного погашения облигации). Со дня истечения срока обращения облигации купонный доход не начисляется.

Первый купонный доход по соответствующей облигации начисляется со дня, следующего за днем ее продажи, по день начала выплаты купонного дохода за купонный период, в котором была продана облигация включительно. Последующие купонные доходы (включая последний) начисляются со дня, следующего за днем начала выплаты купонного дохода за предшествующий купонный период, по день начала выплаты купонного дохода по данному купонному периоду включительно (дату погашения).

Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения **плюс 8 (Восемь)** процентных пунктов.

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + \dots + Kn*H*tn)/365*100$$

где:

Д – купонный доход;

t1, t2, tn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде;

K1, K2, Kn – равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс восемь процентных пункта – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;

Н – номинальная стоимость облигации.

При расчете купонного дохода по облигации принимается календарное количество дней в году.

Выплата купонного дохода производится в наличном либо безналичном порядке по требованию предъявителя оригинала облигации в ОАО «АСБ Беларусбанк». В случае если день начала выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется, начиная с первого рабочего дня, следующего за нерабочим днем.

Выплата купонного дохода осуществляется филиалами, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

При досрочном погашении облигации сумма неполученного купонного дохода рассчитывается за весь период владения облигацией с даты, следующей за датой продажи облигации, по дату ее досрочного погашения включительно.

**6.9. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Облигация может быть предъявлена к досрочному погашению, но не ранее рабочего дня, следующего за днем истечения трех месяцев со дня ее продажи. При этом предъявителю оригинала облигации выплачивается ее номинальная стоимость и неполученный купонный доход за весь период владения облигацией (с даты, следующей за датой продажи облигации, по дату досрочного погашения облигации включительно).

При досрочном погашении облигации выплата части номинала облигации, части купонного дохода не производится.

**6.10. Порядок погашения облигаций**

Погашение облигации осуществляется, начиная с 01 сентября 2011 года, в отношении лица, предъявившего оригинал облигации в Банк к погашению.

Погашение облигации независимо от места ее продажи осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

При погашении облигации владельцу возмещается номинальная стоимость облигации наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. При погашении облигации выплата части номинала облигации и/или части купонного дохода не производится.

**6.11. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, Банк в срок **не позднее 30 дней** с момента принятия указанного решения возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами (с даты, следующей за датой продажи облигаций, до даты ее возврата, но не позднее дня истечения **30 дней** с момента принятия вышеуказанного решения) по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 8 (Восемь) процентных пунктов.

**6.12. Дата и номер регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31.07.2009.

Регистрационный номер:

**64** выпуск: 5-200-02-0325;

**65** выпуск: 5-200-02-0326.

**6.13. Информация об обеспечении облигаций**

Банк выпускает облигации без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг», в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа.

Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка. Порядок выпуска облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь.

**Заместитель Председателя Правления – начальник ОПЕРУ ОАО «АСБ Беларусбанк»** **Г.С. Господарик**

**Главный бухгалтер ОАО «АСБ Беларусбанк»** **И.П. Лысоковская**

**http://www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.
Лицензия на профессиональную и биржевую деятельность по ценным бумагам № 02200/0385579 (зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 13.07.2009 № 5200-1246-1024). УНП 100325912.